Падтрымай "Вясну" на PATREON

Актывіста з Гомеля будуць судзіць за пікет супраць расстрэлаў

22.08.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед



Мікалай Пяшко праводзіць акцыю супраць смяротнага пакарання ў Беларусі. Фота: naviny.by

Гомельскага актывіста **Мікалая Пяшко** будуць судзіць за правядзенне ў цэнтры горада несанкцыянаванага масавага мерапрыемства (артыкул 23.34 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях). Адпаведны пратакол, як паведаміў Пяшко, у дачыненні да яго склалі 18 жніўня ў аддзяленні міліцыі Цэнтральнага РАУС Гомеля, куды яго напярэдадні выклікалі па тэлефоне.

Паводле інфармацыі "Гомельскай Вясны", падставай для складання пратаколу паслужылі фатаграфіі з месца правядзення пікета, зробленыя з камер відэаназірання ўнівермага «Гомель».

«У перыяд часу з 14.00 да 15.00 гадзін 9 жніўня Пяшко Н.І., знаходзячыся на пляцоўцы перад універмагам «Гомель» па вул. Савецкая, 60 у Гомелі правёў пікет за адмену смяротнага пакарання ў Беларусі з парушэннем установленага парадку правядзення такіх мерапрыемстваў паўторна на

працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні», - напісаў у пратаколе ўчастковы, старэйшы лейтэнант міліцыі **Юры Град**.


> *«Я запытваў, як таго патрабуе заканадаўства аб масавых мерапрыемствах, папярэдні за 15 дзён дазвол на правядзенне пікету, аднак улада мне ў гэтым адмовіла. Нацыянальны закон забараняе арганізоўваць мірныя сходы тым асобам, якія раней прыцягваліся да адказнасці за ўдзел у такіх сходах. Мяне за ўдзел у акцыях пратэстаў вясной гэтага года двойчы прыцягвалі, я быў вымушаны плаціць буйны штраф і адбыць у ІЧУ 7 сутак арышту»,* - пракаментаваў актывіст Пяшко.

Мікалай Пяшко нагадаў, што нягледзячы на забарону гарадскіх уладаў у правядзенні мірнага сходу ён разам з іншымі актывістамі выйшлі на вуліцу, дзе раздалі мінакам тэматычныя ўлёткі і кнігі «Каму патрэбна смяротнае пакаранне». Такім чынам, яны хацелі прыцягнуць увагу да абвешчанай Amnesty International акцыі супраць смяротнага прысуду жыхару Нароўлі Аляксею Міхаленю.


Вядома, што іншых удзельнікаў акцыі супраць смяротнага пакарання ў Беларусі супрацоўнікі міліцыі пакуль не турбавалі.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"









АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY